# “Калісь глядзеў на сонца я...”

## Галерэя партрэтных вобразаў да 135-годдзя Максіма Багдановіча



***Віктар Крук*. Партрэт М. Багдановіча.**

2011 г. Палатно, алей.

*Літаратурны музей Максіма Багдановіча.*

ФОТАГАЛЕРЭЯ ПАЭТА




**Марыя Апанасаўна з сынам.**
Гродна, 1892–1893 гг.



**Сям'я Багдановічаў.** Гродна, 1895 г.




**Браты Вадзім і Максім.**
Гродна, 1893 г.




а)




б)

**Цётка Марыя Ягораўна з пляменнікамі** (а, б*).
Ніжні Ноўгарад, 1897 г.

* *Арыгіналы фотаздымкаў не захаваліся. Выявы друкуюцца паводле выдання: Багдановіч М. Творы: у 2 т. – Мн., 1927–1928.*



Яраслаўль, 1909 г.



М. Багдановіч сярод таварышоў-студэнтаў (за сталом, сёмы справа).
*З фотографічнай групы 1914-га году.*

**Ліцэйскі бібліятэчны гуртор*.** Яраслаўль, 1914 г.



М. Багдановіч
сярод супрацоўнікаў рэдакцыі газ. „Голос".
З фотографічнае карткі 1915-га году.

**Рэдакцыя газеты "Голас"*.** Яраслаўль, 1915 г.(?)



Максім Багдановіч.
*З фотографічнай групы 1915-га году.*

Яраслаўль, 1915 г.*(?)

* *Арыгіналы фотаздымкаў не захаваліся. Выявы друкуюцца паводле выдання: Багдановіч М. Творы: у 2 т. – Мн., 1927–1928.*



# КАНАНІЧНАЯ ВЫЯВА МАКСІМА БАГДАНОВІЧА І НЕКАНАНІЧНЫ АЎТОГРАФ




**Максім Багдановіч** (фота і адварот). Яраслаўль. 1911 г.

Мы прывыклі ведаць герояў у твар, нават калі выява, асабліва мастацкая, не зусім адпавядае рэальнасці. Прыжыццёвых партрэтаў дзеячаў мінуўшчыны захавалася вобмаль, таму перавважае мастацкая рэканструкцыя іх абліччаў.

Раннія чытачы Максіма Багдановіча не ўяўлялі, як выглядае паэт. Першая выява Максіма Адамавіча была апублікавана ў часопісе "Рунь" у 1920 г. (№ 5-6), праз тры гады пасля яго смерці. Фотаздымак стаў кананічным, на яго мы арыентуемся сёння. Калі ж у 1940 г. супрацоўнікі рэдакцыі юнацкай літаратуры Дзяржвыдавецтва БССР звярнуліся да Адама Багдановіча з просьбай вылучыць здымак, які найлепш адлюстроўвае знешнасць паэта, ён разгубіўся. І напісаў, што варта было б змясціць два: фота 1911 г. і выкадроўку з групавога здымка рэдакцыі газеты "Голас" – вядомую сёння выяву, на якой Максім Багдановіч мае вусы.

З той пары сітуацыя моцна не змянілася. Нягледзячы на масавае развіццё фатаграфіі ў пачатку XX ст. і даволі высокі дастатак сям'і Багдановічаў, фотаздымкаў Максіма мы ведаем мала. Здымак з мамай (1 год), братам Вадзімам (2 гады), групавы сямейны (4 гады) – зробленыя ў Гродне. Фота з братамі і цёткай Марыяй у Ніжнім Ноўгарадзе (6 гадоў, у 2 варыянтах). У Яраслаўлі зроблены партрэтнае фота 1909 г. (17 гадоў), партрэтнае фота 1911 г. (19 гадоў), групавы здымак рэдакцыі "Голас" (23 гады) і размытая выява ліцэйскага бібліятэчнага гуртка (23 гады?).

Акрамя названых маем яшчэ некалькі. Але ў супрацоўнікаў музея ёсць сумневы, ці сапраўды на іх Максім Багдановіч. Гэта два варыянты групавога здымка гімназістаў у Яраслаўлі, здымак з кнігі "Максім Багдановіч" (1989) Л. Зубарава з маладым чалавекам у фуражцы разам з Ганнай і Мікалаем Какуевымі, а таксама выкадроўка з яго. Можна згадаць і растыражаванае памылковае фота, якое пісьменнік Алесь Бачыла змясціў на вокладцы кнігі "Дарогамі Максіма Багдановіча" (1983).

Атрымліваецца, што мы арыентуемся ў асноўным на дзве выявы: партрэтнае фота 1911 г. і выкадроўку са здымка рэдакцыі "Голаса", арыгінал якога, дарэчы, не захаваўся. Згодна са словамі Адама Ягоравіча, на выкадроўцы праз рэтуш М. Багдановіч атрымаўся занадта паўнатварым, і на гэта таксама варта рабіць папраўку.

Фота 1911 г. зроблена пасля заканчэння Яраслаўскай мужчынскай гімназіі ў 1911 г., незадоўга да паездкі ў Вільню і Ракуцёўшчыну. А ўнікальнасці яму дадае верш-аўтограф – рускі варыянт пачатку паэмы "Веранікa".

*Я вспоминаю домъ старинный,*
*На тихой улицѣ фасадъ,*
*И небольшой уютный садъ,*
*И дворъ просторный и пустынный.*

*На немъ кипѣли игры наши:*
*При общемъ шумѣ взмахъ руки*
*Вдругъ "бралъ на выносъ" городки,*
*И смѣхъ звучалъ при видѣ "каши".*

Максім Багдановіч у апошнія гады навучання ў гімназіі блізка пазнаёміўся з сям'ёй Какуевых і стаў часта бываць у іх. Акрамя фота, Мікалаю Какуеву паэт падарыў і сваю кнігу "Вянок" (1913) з аўтографам. Іх пасля смерці Мікалая захоўвала яго сястра Ганна Рафаілаўна Какуева – муза паэта. Яе сын Мікалай Іванавіч Лілееў перадаў здымак Ніне Ватацы, а тая ў 1981 г. падаравала яго ў Літаратурны музей Максіма Багдановіча.

Супрацоўнікі музея не трацяць надзеі, што яшчэ знойдуцца і невядомыя раней здымкі Максіма Багдановіча. Магчыма, яго фатаграфаваў знакаміты Максім Дзмітрыеў з Ніжняга Ноўгарада, і нейкім цудам адшукаюцца невядомыя раней выявы гімназічнай альбо ліцэйскай пары. У музей час ад часу звяртаюцца па атрыбуцыю фотаздымкаў, але пакуль адкрыццяў не здарылася.

Таму не спыняемся і працягваем пошук!

**Міхась БАРАНОЎСКІ,**
загадчык Літаратурнага музея Максіма Багдановіча.